5. Орлова, Т.Д. Жанровая дифференциация в журналистике // Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы: матэрыялы рэсп. навук.-практ. семінара, 2–3 чэрвеня 2011 г. – Минск, 2011. – С. 175–181.
6. Стральцоў, Б.В. Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста / Б.В. Стральцоў. – Минск: БДУ, 2002. – 118 с.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ГІСТОРЫЯ «ЗВЯЗДЫ» Ў НАВУКОВЫМ АСЭНСАВАННІ

У сістэме сучаснай грамадска-палітычнай прэсы газеце “Звязда” належыць выключная роля. Менавіта гэта выданне вызначыла напрамак развіцця беларускага нацыянальнага друку. Выдаўцамі “Звязды” была распрацавана тэорыя нацыянальнай публіцыстыкі, на яе старонках сфарміравалася прафесійная журналісцкая школа.

Вывучэнне гісторыі станаўлення і развіцця дадзенага выдання запатрабавана сучасным працэсам пераасэнсавання каштоўнасных арыентыраў, вопыту практычнай дзейнасці. У працэсе даследавання асобных аспектаў развіцця газеты ў розныя гістарычныя перыяды акцэнты рабіліся на адпаведнасці яе працы тым грамадска-палітычным працэсам, у кантэксце якіх існавала выданне. Тым не менш, менавіта “Звязда” належыць да тых газет, дзейнасць якой у розныя часы прыцягвала ўвагу гісторыкаў друку.

Практычна першай спробай навуковага асэнсавання працэсу развіцця газеты стала выдадзеная ў 1957 г. манаграфія М.С. Зярніцкага «Газета “Звезда» ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі” (Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957). Дзейнасць рэдакцыі “Звязды” разглядаецца аўтарам ў кантэксце развіцця агульнабальшавіцкага руху на тэрыторі Беларусі. Па сутнасці, у выданні былі адлюстраваны важнейшыя грамадска-палітычныя працэсы, апублікаваны галоўныя праграмныя дакументы савецкай улады. Акрамя таго, масавая бальшавіцкая газета выконвала вялікую працу па арганізацыі эфектыўнай дзейнасці рэдакцыі, якасці газетных матэрыялаў, выкарыстоўваючы разнастайныя формы і метады масавай работы, практычны вопыт іншых бальшавіцкіх газет.

Значнасць наступнага даследавання М.С. Зярніцкага “Белорусская советская печать в годы иностранной интервенции и гражданской войны” (Минск, Высшая школа, 1963) заключаецца якраз у тым, што аўтар разглядае дзейнасць газеты ў кантэксце фарміравання беларускай

дзяржаўнасці, калі ў найскладанейшых грамадска-палітычных умовах барацьбы з нямецкімі і польскімі акупантамі фарміравалася новая ідэалогія, вызначаліся напрамкі развіцця дзяржавы. Так, менавіта "Звязда" надрукавала пастанову УЦВК "Аб прызнанні незалежнасці Беларускай ССР" і інш. дакументы. Названыя вышэй працы М.С. Зярніцкага па навуковаму асэнсаванню і абагульненню вопыту першых год дзейнасці рэдакцыі, аналізе зместу публікацый газеты маюць каштоўнасць і ў плане прадастаўлення факталагічнага матэрыялу, паколькі ў архівах і бібліятэках Рэспублікі Беларусь на сённяшні дзень адсутнічаюць гэтыя нумары выдання.

Даследаванне дзейнасці "Звязды" ў працах пазнейшых часоў ажыццяўляецца ў кантэксце новых рэалій савецкага часу, такіх, як, напрыклад, рабселькораўскі рух, у арганізацыі якога менавіта гэтаму выданню належыць кіруючая роля. Так, Р.В. Булацкі ў манаграфіі "Первые рабселькоры Белоруссии" (Минск, Наука и техника, 1969) праводзіць адпаведны агляд публікацый газеты. Публіцыстыка "Звязды" пераважае ў матэрылах такіх даследаванняў савецкага часу, як Г.В. Булацкий "Печать Белоруссии в период завершения реконструкции народного хозяйства республики" (Минск, БГУ, 1960), В. Пыжкоў "Друк Беларусі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXI з'езда КПСС" (Мінск, 1960), "Из истории партийно-советской печати". Сборник статей (Минск, БГУ, 1960), С.В. Марцелев "На путях строительства социализма. Печать Белоруссии в 1926-1937 гг." (Минск, Беларусь, 1972 ) і інш.

Значны ўклад рэдакцыя "Звязды" ўнесла ў барацьбу з фашысцкімі акупантамі. Нягледзячы на тое, што практычна напачатку вайны быў спынены выхад афіцыйнай газеты "Звязда", яе вопыт актыўна выкарыстоўваўся газетамі, якія выпускаліся ва ўмовах акупацыі і захоўвалі назву галоўнага выдання рэспублікі. У навукова-публіцыстычным даследаванні М.Е. Дастанкі "Газета "Звязда" ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (Мінск, БДУ, 1970) прадстаўлены поўны спектр дзейнасці выдання: змест публіцыстыкі, жанравыя і стылістычныя асаблівасці матэрыялаў, арганізацыя працы рэдакцыі ва ўмовах падполля.

Так, важным і значным крокам у наладжванні выдавецкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаў выпуск газеты "Звязда" як органа Мінскага гарадскога камітэта партыі. На жаль, у найскладанейшых умовах акупацыі ўдалося падрыхтаваць толькі чатыры нумары гэтай газеты. У канцы 1942 г. на Любаншчыне ў зоне

размяшчэння партызанскіх атрадаў быў наладжаны выпуск "Звязды" як органа Мінскага абласнога падпольнага камітэта партыі. Газета актыўна публікавала інфармацыю аб наступленні савецкіх войск і вызваленні тэрыторыі Беларусі ад акупантаў, заклікаючы народ да барацьбы з ворагам. У ліпені 1944 г. ізноў "Звязда" выйшла ў вызваленым Мінску як орган ЦК КП(б) Беларусі, Саўнаркама і Прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Беларускі народ увекавечыў подзвіг выдаўцоў газеты. Так, яе рэдактар У.С. Амельянюк быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. У 1965 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР рэспубліканская газета "Звязда" была ўзнагароджжана ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

Пасляваенная дзейнасць газеты "Звязда" прадстаўлена ў працах такіх даследчыкаў беларускай журналістыкі, як Булацкі Р.В., І.І. Сачанка, С.В. Говін "Гісторыя беларускай журналістыкі " (Мінк, БДУ, 1979), С.В. Марцелев "Печать советской Белоруссии" (Минск, Беларусь, 1967), "Печать Белоруссии в период развитого социализма" (Минск, Беларусь, 1982), А.Ф. Мяснікоў "Сацыялістычнае спаборніцтва і друк Беларусі", (Мінск, БДУ, 1980) і інш. Да 50-годдзя "Звязды" выйшаў зборнік публіцыстычных нарысаў "Наша "Звязда" (Мінск, Беларусь, 1968), у які ўвайшлі матэрыялы супрацоўнікаў рэдакцыі, гісторыкаў друку.

Новым этапам у даследаванні дзейнасці "Звязды" сталі працы па гісторыі беларускага друку, падрыхтаваныя ў постсавецкі час. Па многіх крытэрыях пераасэнсавана дзейнасць выдання ў даследаваннях А.Г. Слукі "Беларуская журналістыка. Ч2." (Мінск, БДУ, 2003), "Беларуская журналістыка. Ч3." (Мінск, БДУ, 2009), "Беларуская журналістыка" (Мінск, БДУ, 2011). З цягам часу цікавасць да газеты не згублена. Нягледзячы на ўнушальнную колькасць рознага кшталту публікацый пра дзейнасць "Звязды", яе вывучэнне працягваецца. Так, да 90-годдзя выдання быў падрыхтаваны зборнік Матэрыялаў Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, БДУ, 2007), арганізаванай факультэтам журналістыкі БДУ сумесна з рэдакцыяй.

Сучасныя падыходы да аналізу дзейнасці на сённяшні дзень старэйшага ў краіне грамадска-палітычнага выдання не зменшылі яго значэння. Новы час дае магчымасць прадоўжыць даследаванне матэрыялаў "Звязды". Многія напрамкі яе дзейнасці патрабуюць перааасэнсавання, вывучэнне асобных пытанняў стала магчымым толькі зараз. Ва ўсе перыяды газета "Звязда" была і застаецца люстэркам рэчаіснасці, у якім ужо на працягу стагоддзя адбіваецца гісторыя развіцця беларускай дзяржавы.